***А. І. Бабко,***
*кандыдат філасофскіх навук, дацэнт*

# НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ІДЭЯ І «НАЦЫЯНАЛЬНЫ ЭРАС» У ЖЫЦЦІ І ТВОРЧАСЦІ АЛЕСЯ ГАРУНА

У прысвечаных жыццю і творчасці Алеся Гаруна тэкстах абавязкова адзначаецца і падкрэсліваецца яго палымяная любоў да Радзімы («нацыянальны эрас» – у вызначэнні А. Адамовіча [1, с. 1085]). Нават павярхоўнае знаёмства з творамі паэта і з асноўнымі фактамі яго біяграфіі не пакідае сумненняў у справядлівасці такіх сцверджанняў, а пры іх уважлівым разглядзе ён паўстае як асоба, што ўражвае сваёй прасякнутасцю беларускай нацыянальнай ідэяй і адданасцю беларускай нацыянальнай справе. Гэта асоба сакратычнага тыпу, для яе характэрна адзінства слова, думкі і ўчынкаў.

Нацыянальная ідэя беларускага народа (як і ўсялякага іншага) найбольш усведамляецца ў філасофскай нацыянальнай традыцыі, дзе яна фіксуецца ў тэарэтычнай форме. Але і мастацтву тут належыць істотная роля: спалучаючы ў сабе філасафічнасць і вобразнасць, яно выступае як надзвычай дзейсны сродак яе артыкуляцыі, трансляцыі і здзяйснення. Па сутнасці, ідэя пэўнага народа – гэта спосаб выяўлення ў адпаведнай яго існасці адметнай, непаўторнай форме агульначалавечых прынцыпаў, і таму яна выступае як яго ідэал.

У кожнага народа ёсць асобы, якія выконваюць ролю своеасаблівых духоўных арыенціраў у яго́ным духоўным жыцці, ім наканавана выступаць увасабленнем яго ідэалу. Нацыянальная ідэя, нацыянальныя інтарэсы, надзеі і мары народа ўспрымаюцца імі як найвышэйшая каштоўнасць, а іх здзяйсненне – як галоўная мэта, як мэта жыцця. У рамане Ф. М. Дастаеўскага «Падлетак» гаворыцца пра «ідэю-пачуццё»: чалавек настолькі прасякаецца ідэяй, што яна адчуваецца ўсімі фібрамі яго душы, з'ядноўваецца, зліваецца з пачуццямі і эмоцыямі, так што не можа быць абвергнута чыста лагічнымі аргументамі. Калі весці гаворку пра нацыянальную ідэю, дык яна ў гэтым выпадку знітоўваецца з глыбокім, усеабдымным пачуццём любові да Радзімы, нацыянальным эрасам. Як вынікае з папярэдняга тэксту, такая знітаванасць выступае найгрунтоўнейшай рысай жыцця і творчасці Алеся Гаруна.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Паэт адчуваў, бачыў і ўсведамляў, які нялёгкі, няпросты жыццёвы шлях ён абраў, у ягоным выпадку нялёгкі і няпросты да трагізму. За ўдзел у рэвалюцыйным руху ён быў асуджаны на катаргу, якая была заменена на пажыццёвую ссылку, і гэтая ссылка доўжылася дзевяць гадоў – ад 1908 да 1917 г. [3, с. 339]. Ён надзвычай востра перажываў сваю разлуку з Радзімай:

Доля мая – гэта доля гаротная,
Сэрца дала мне, наўчыла любіць,
Дый прысудзіла яна ж, адваротная,
Век у выгнанні, ў сіроцтве пражыць.
Што мне жыццё, хоць бы самае краснае?
Волі не маю! Ў няволі жыву.
Гэтае нуднае быцце ўласнае
Смерцю страшэннаю з болем заву.
Сокалам вольным і з пташшай гулліваслю
Я бы, здаецца, адсюль паляцеў…
Нельга і думаці, – доля без міласці
Варту паставіла. Вораг абсеў [2, с. 48].

Паэт ясна ўяўляў сабе, што ў дадзенай сітуацыі існуе і іншы шлях, значна больш лёгкі і просты:

Горшая мука ўтрапляець, што сынам я
Быць перастану сваёй старане.
Памяць не доўгая, любасць не вечная;
Сірасць, бязлюднасць – іх трудна нясці;
Мо, пажагнаўшыся з старым, на вечнае
З шляху звярну, па другім каб ісці [2, с. 49].

У гэтых паэтычных радках у мастацкай форме перадаюцца перажыванні высокага экзістэнцыяльнага напружання. Такога кшталту перажыванні будуць потым прадметам грунтоўнага філасофскага аналізу, з асаблівай пранікнёнасцю і глыбінёй здзейсненага М. Хайдэгерам. У ягоным «Sein und Zeit» («Быццё і час») даводзіцца пра тое, што чалавек павінен узняцца да сітуацыі экзістэнцыяльнага выбару, выбару паміж сапраўдным і несапраўдным быццём, паміж няпростым, пазбаўленым ілюзій быццём у адпаведнасці з поклічам сумлення і быццём у няпэўным, безасабовым, але надта спакуслівым модусе – як усе. Узняўшыся да гэтага выбару, абраўшы такую сітуацыю, ён абавязаны заставацца ў ёй, каб быць асобай, быць самім сабой [5, с. 267–270].

А. Гарун, відавочна, наважыўся прайсці праз усе перажыванні, выпрабаванні і калізіі, з якімі быў звязаны абраны ім шлях. «Гэта –

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

святлейшы ідэал сучаснага мучальніка за ідэю», – зусім справядліва напісаў пра яго М. Гарэцкі [3, с. 340].

Паэт надзвычай востра перажываў трагічны разлад паміж ідэалам разняволенага ў нацыянальным і сацыяльным плане народа і рэчаіснасцю яго паднявольнага жыцця. У значнай ступені гэтую вастрыню абумоўлівала фізічная адасобленасць ад роднага краю, што не дазваляла яму напоўніцу працаваць дзеля згаданага высокага ідэалу. Ён прагне гераічнага чыну – дзеля шчасця беларускага народа і ўсяго чалавецтва, паколькі і тое, і другое цесна звязаны паміж сабой, – і адчувае яго немагчымасць у тых умовах, у якія яму было наканавана патрапіць. Гэта знайшло выразны паэтычны адбітак у вершы «Ноч»:

У гэту ноч мне няўмоч –
Няма сілы чакаць і маліцца…
Каб я ўмеў, каб я смеў
Узляцець, паляцець ці разбіцца!
Як сакол, як арол,
Я падняўся б высока страшэнне,
Я б узяў, я б украў,
І сабе і ўсім адпушчэнне…
Але ж не, то не мне
От такая вялікая доля:
Узляцець-паляцець
Ці ўпасці разбітым на поле [2, с. 46].

Наўрад ці слушна тут меркаваць, што паэт падзяляў меркаванне Гегеля аб празаічным, негераічным характары сучаснай эпохі [4, с. 192–194]. Ён, хутчэй, рэалістычна ацэньваў палітычную і духоўную сітуацыю ў міжрэвалюцыйны перыяд і не бачыў іншага выйсця, як стаічна перанесці яе, маючы на ўвазе магчымасць новага рэвалюцыйнага ўздыму:

Без пакоры ў пакоры
Перабудзем сваё гора [2, с. 55].

Пры гэтым паэт ніколькі не сумняваўся ў вяршэнстве барацьбы, змагання ў сапраўдным быцці чалавека: аддадзенае змаганню жыццё ён параўноўвае з праменьчыкам святла, што хоць крышку працінае беспрасветную пушчу паднявольнага існавання [2, с. 56].

Адзначым, што рыгарыстычная маральна-філасофская пазіцыя А. Гаруна спалучаецца (у адрозненне, напрыклад, ад суровай этыкі М. Хайдэгера на грунце ўяўлення аб субстанцыянальнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нікчэмнасці чалавека) з эўдэманістычным прынцыпам. У вершы «Ідуць гады» ён піша:

> Прысуджаны шлях свой рабі дарагім,
> Красуйся на радасць сабе і другім [2, с. 64].

Статычнае «прысуджаны шлях свой» спалучаецца тут з эўдэманістычным «красуйся на радасць сабе і другім». Дадзенае спалучэнне ўвогуле праймае ўсё духоўнае жыццё А. Гаруна, і яго ні ў якім разе нельга разглядаць як эклектычнае. Для паэта абодва моманты цесна звязаны паміж сабой. І справа тут не толькі ў яго левых палітычных перакананнях, не толькі ў тым, што пакутніцтва асвятляецца будучым шчасцем чалавека і чалавецтва. А. Гарун адчувае, што ў самой структуры Сусвету і чалавечага быцця ў ім ёсць глыбокая, патаемная падстава для светлай, радаснай, эўдэманістычнай філасофскай пазіцыі. Яна можа згубіцца, можа быць растаптанай і змяшанай з брудам у тлумным свеце – як чыстая дзявочая прыгажосць ці чысцюткі белы снег [2, с. 223], але яна ёсць і яна здольная даць сілы і натхненне для змагання і творчасці.

Відавочна, што для А. Гаруна адданасць нацыянальнай ідэі, ідэі свабоды і шчасця свайго народа, лучнай са свабодай і шчасцем кожнага чалавека і ўсяго чалавецтва, звязана з гэтай чыстай і светлай падставай быцця. І таму, як ні цяжка несці яе па жыцці, страціць яе – значыць, разбурыць, знішчыць сябе як асобу. Разам з тым экзістэнцыяльны цяжар сапраўднага быцця патрабуе гарту, самадасканалення, самапераадолення і творчасці. Але тварыць сябе, жыць творча – гэта і значыць быць шчаслівым.


1. *Адамовіч, А.* Да гісторыі беларускай літаратуры / А. Адамовіч. – Менск : Выд. Зьміцер Колас, 2005. – 1464 с.

2. *Гарун, А.* Выбраныя творы / А. Гарун. – Менск : Беларус. кнігазбор, 2003. – 448 с.

3. *Гарэцкі, М.* Гісторыя беларускай літаратуры / М. Гарэцкі. – Мінск : Мастац. літ., 1992. – 479 с.

4. *Hegel, G. W. F.* Ästhetik : In 2 Bänden / G. W. F. Hegel. – Berlin und Weimar : Aufbau Verlag, 1976. – Bd. 1. – 591 S.

5. *Heidegger, M.* Sein und Zeit / M. Heidegger. – Tübingen : Max Niemeyer Verlag, 1993. – 445 S.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ